**САВЕТ РЭСПУБЛІКІ**
**НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ**
**РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**САКРАТАРЫЯТ**

вул. Чырвонаармейская, 9
220016, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь
тэл./факс (017) 327 46 74, факс (017) 327 23 18
E-mail: cr@sovrep.gov.by

**СОВЕТ РЕСПУБЛИКИ**
**НАЦИОНАЛЬНОГО СОБРАНИЯ**
**РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

**СЕКРЕТАРИАТ**

ул. Красноармейская, 9
220016, г. Минск, Республика Беларусь
тел./факс (017) 327 46 74, факс (017) 327 23 18
E-mail: cr@sovrep.gov.by

25.06.2024 № 27/М-315(2)
На № ______________ от ___________

Дзякуем Вам за актыўную грамадзянскую пазіцыю і праяўленую ініцыятыву.

Згодна з артыкулам 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь дзяржаўнымі мовамі ў Рэспубліцы Беларусь з’яўляюцца беларуская і руская мовы.

Законам Рэспублікі Беларусь ад 26 студзеня 1990 г. № 3094-XI «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь» (далей — Закон № 3094-XI) замацавана, што Рэспубліка Беларусь забяспечвае ўсебаковае развіццё і функцыянаванне беларускай і рускай моў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця. Дзяржаўныя органы і іншыя арганізацыі ў адпаведнасці з заканадаўствам ствараюць грамадзянам неабходныя ўмовы для вывучэння беларускай і рускай моў і дасканалага валодання імі. Кіраўнікі, іншыя работнікі дзяржаўных органаў і іншых арганізацый павінны валодаць беларускай і рускай мовамі ў аб’ёме, неабходным для выканання імі сваіх службовых абавязкаў (артыкулы 2, 4).

Артыкулам 5 Закона № 3094-XI устаноўлены абавязак дзяржаўных органаў і іншых арганізацый прымаць і разглядаць звароты, якія падаюцца грамадзянамі на беларускай або рускай мове. Пры гэтым адмова службовай асобы прыняць і разгледзець зварот грамадзяніна на беларускай або рускай мове са спасылкай на няведанне мовы звароту цягне за сабой адказнасць у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі. Адказ на зварот афармляецца на мове звароту.

Што датычыцца дзяржаўных служачых, то Законам Рэспублікі Беларусь ад 1 чэрвеня 2022 г. № 175-З «О государственной службе» вызначаны шэраг кваліфікацыйных патрабаванняў, якія прад’яўляюцца пры паступленні на дзяржаўную грамадзянскую службу, адным з якіх з’яўляецца валоданне дзяржаўнымі мовамі Рэспублікі Беларусь (падпункт 1.3 пункта 1 артыкула 30).

Начальнік Сакратарыята А.В.Мальцаў